# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

№ 3 (694) ● Пятніца 19 студзеня 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI


## АПОШНІ ЗВАНОК І ПЕРШАЯ СЕСІЯ

Першая сесія на самым маладым факультэце—журфаку...

Як жа яна праходзіць? Якімі поспехамі адзначаны першыя крокі факультэта?

Яшчэ ў снежні на чацвёртым курсе празвінеў апошні званок. Здадзены ўсе залікі і экзамены. Заключным быў дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму. З дваццаці трох, хто здаваў навуковы камунізм, сямнаццаць атрымалі «выдатна» і «добра». Старшыня камісіі А. Д. Гусеў застаўся задаволены многімі адказамі.

Пасля таго, як чацвёрты курс пайшоў на практыку, «старэйшымі» на факультэце засталіся трэцякурснікі. Ім прыходзіцца нялёгка. Шэсць залікаў і столькі ж экзаменаў — усё гэта было вынесена на зімовую сесію. І вось здадзены ўжо ўсе залікі, частка экзаменаў. Вынікі добрыя. Зусім нядаўна здадзена палітэканомія.

На пытанне, як падрыхтаваны трэцякурснікі да экзамена, выкладчык В. С. Ямелін адказаў, што большая частка студэнтаў, і асабліва першая група, была ўпэўнена ў сваіх ведах. У гэтай групе былі толькі лічаныя здавальняючыя адзнакі. На выдатна адказалі В. Тарасевіч, С. Супрун, Г. Сыраежка, Л. Карасёва, Н. Сакалоў.

Першы курс на журфаку самы вялікі. Гэтая сесія для яго рашаючая. Колькі было хваляванняў! Але залікі і экзамены паказалі, што многія сустрэлі сесію добра падрыхтаванымі. На экзамене па гісторыі КПСС лепшымі былі адказы ў студэнтаў В. Шмырынай, С. Алексіевіч, В. Нычкінай, Э. Мельнікава, М. Толсціка. Але для некаторых, як кажуць, першы блін аказаўся камяком. Нездавальняючыя адзнакі атрымалі студэнткі Н. Пузікава, І. Вялюгіна, З. Шаўцова.

Ёсць і такія, што не здалі залікі і не былі дапушчаны да экзаменаў.

Нялёгка ісці па ступеньках сесіі. Першыя няўдачы прымусяць студэнтаў задумацца над «горкімі» ўрокамі і зрабіць адпаведныя вывады.

Шлях ад першай сесіі да апошняга званка ляжыць толькі праз упартасць і стараннне кожнага студэнта.

С. АЛЯКСАНДРАЎ,
студэнт.



*Па таму, як радасна свецяцца вочы дзяўчыны, можна сказаць, што сесія для яе была паспяховай. Усе тры экзамены зімовай сесіі Таіса Дзевялтоўская здала на выдатна. Сябры Таісы, студэнты другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта могуць сказаць аб ёй не толькі як аб дзяўчыне, якая з усёй адказнасцю адносіцца да вучобы і працы, але і як аб добрай спартсменцы-парашутыстцы.*
*Фота І. АСКІРКІ.*



*На здымку: журналісты на экзамене ў В. С. Ямеліна.*



*НА ЗДЫМКУ: студэнтка трэцяга курса хімічнага факультэта В. Коць здае экзамен А. В. Чалею па тэарэтычнай фізіцы.* *Фота І. АСКІРКІ.*

## ПАТРАБАВАННІ І ВЫНІКІ

### НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

**— Скажыце, калі ласка, як праходзіць сесія на юрыдычным факультэце? Як падрыхтаваны да яе студэнты?**

**Як выглядае сесія гэтага года ў параўнанні з мінулай?**

**Якія меркаванні аб ходзе сесіі ў выкладчыкаў?**

З такімі пытаннямі мы звярнуліся да намесніка дэкана юрыдычнага факультэта Сяргея Пятровіча Бекешка.

— Сказаць што-небудзь канкрэтнае зараз яшчэ цяжка. Гэта можна зрабіць толькі пасля аналізу ўсіх даных. Ну, а, наогул, сесія праходзіць нядрэнна. Нездавальняючыя веды паказваюць толькі тыя, хто раней не працаваў. Але значная частка студэнтаў трымаецца на экзаменах даволі ўпэўнена; пераканаўча даказваюць, лагічна абагульняюць. Усе выкладчыкі, з якімі прыходзілася мне размаўляць, кажуць, што студэнты добра падрыхтаваны да сесіі.

А лепш за ўсё пройдзем самі па аўдыторыях і кабінетах і паглядзім, як здаюць.

Мы пайшлі... Усе калідоры запоўнены студэнтамі. Хвалююцца, чакаюць сваёй чаргі. Тут жа мы сустрэлі загадчыка кафедры грамадзянскага права і працэсу Г. А. Павец'ева, які толькі што экзаменаваў па савецкаму працоўнаму праву студэнтаў другога курса юрфака. З тымі ж пытаннямі мы звярнуліся да яго.

— Параўнаць з вынікамі мінулага года не магу, таму што па некаторых прычынах я ўжо некалькі гадоў практычных заняткаў са студэнтамі не вёў. Але хачу сказаць, што студэнты падрыхтаваны добра.

Ідзем далей. Ля дзвярэй адной з аўдыторый група студэнтаў першага курса. Пытаемся, што здаюць.

— Арганізацыю суда і пракуратуры ў СССР.

І. І. Марціновіч, дацэнт кафедры крымінальнага права, так характарызуе свой экзамен:

— У цэлым праходзіць нядрэнна. Пераважная колькасць студэнтаў паказвае грунтоўныя веды. Але ёсць і такія, што атрымалі «нездавальняюча». Прычыны? На працягу семестра сістэматычна не рыхтаваліся. Сярод такіх студэнтаў В. Трапша, Л. Падымака, Л. Хільчык, А. Папко і іншыя. У параўнанні з мінулым годам вынікі горшыя. Чаму? Больш патрабаванняў — гэта папершае, а па-другое—не было самай неабходнай літаратуры.

Паслухаем, што гаворыць дацэнт П. К. Еўдакімаў аб экзамене на другім курсе:

— Студэнты гэтага курса мелі лепшыя магчымасці падрыхтавацца да экзамена. Згодна новаму навучальнаму плану павялічылася колькасць лекцый і семінараў. Выйшлі з друку два новыя падручнікі па курсу савецкага адміністрацыйнага права, апрача таго, другі курс—гэта не першы. Агульныя тэарэтычныя пазнанні ёсць, і таму здалі яны экзамен значна лепш. Тым больш, што на юрыдычны факультэт паступаюць людзі з вытворчым стажам, а гэта, вядома, мае своеасаблівы ўплыў на адказы студэнтаў.

Старшы выкладчык, кандыдат юрыдычных навук В. П. Сярэбранікаў, абагульняючы вынікі экзаменаў па дзяржаўнаму праву сучасных замежных дзяржаў, так выказаў свае думкі:

— Я супастаўляю толькі дзве групы трэцяга курса. Трэцяя група ведае некалькі горш, чым другая. І ў выніку ёсць дзве нездавальняючыя адзнакі. Студэнты другой групы добра ведалі лекцыйны матэрыял, прапанаваную манаграфічную літаратуру.

Усе гэтыя адказы выкладчыкаў на пастаўленыя пытанні сведчаць аб адным: сесія ідзе з усімі яе характэрнымі рысамі — поспехамі і няўдачамі. Наогул жа, усе выкладчыкі задаволены адказамі студэнтаў і, падводзячы вынікі, з упэўненасцю гавораць, што ў гэтым годзе сесія праходзіць на больш высокім узроўні, чым у мінулым.

А. СІДАРОВІЧ,
студэнт.

## НА ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ ЛІНЕЙЦЫ

### ГІСТФАК

Студэнты - гісторыкі атрымалі ўжо звыш трохсот адзнак на экзаменах. Папярэднія вынікі сведчаць, што бягучая сесія будзе больш «шчаслівай», чым у мінулым годзе. Па-першае, цяпер у экзаменацыйных лістах рэдка ўбачыш «нездавальняюча», па-другое, большасць студэнтаў паказвае глыбокія веды пры адказах. Дастаткова сказаць, што з трохсот адзнак — двесце дваццаць пяць выдатных і добрых. Асабліва задаволенымі засталіся выкладчыкі гісторыі першабытнага грамадства Р. А. Нікольская і археалогіі — Э. М. Загарульскі. У іх толькі па пяць-шэсць студэнтаў з групы атрымалі «здавальняюча», астатнія— «добра» і «выдатна».

### МАТФАК

Першакурснікі матэматычнага факультэта ў сваю першую зімовую сесію здаюць экзамены па чатырох прадметах: гісторыі КПСС, аналітычнай геаметрыі, матэматычнаму аналізу і вышэйшай алгебры. На паўдарозе да фіналу сесіі — пасля двух экзаменаў — «чыстымі» выдатнікамі засталіся 22 студэнты. Сярод іх С. Палякоў, В. Лук'яненка, К. Іваноў, О. Калініна, А. Міхлес, В. Глухаў і іншыя.

### БІЯФАК

Экзамен па біяфізіцы прыняў у студэнтаў трэцяга курса Сяргей Васільевіч Конеў.

Нездавальняючых адзнак няма, але і выдатных нямнога: усяго дзевяць у чатырох групах.

Гэты ж курс здаваў экзамен па гістарычнаму матэрыялізму. Вынікі тут значна лепшыя. Праэкзаменаваныя першая, трэцяя і пятая групы паказалі добрыя веды. Дацэнт Вера Акімаўна Внукава паставіла 27 выдатных, 36 добрых і 10 здавальняючых адзнак.

Паспяхова здае палітэканомію чацвёрты курс. Экзаменуе старшакурснікаў дацэнт Андрэй Пятровіч Скуман.

# Якуб Колас і Беларускі універсітэт

**ДА 50-ГОДДЗЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ**

У адной са сваіх малавядомых біяграфій Я. Колас пісаў: «У 1921 г. вясною прыехаў у Мінск, быў членам тэрміналагічнай камісіі, а затым членам Інстытута Беларускай культуры, дзе застаюся і па гэты час.

У Мінску выкладаю методыку роднай мовы ў Беларускім педагагічным тэхнікуме».

Прыехаўшы ў Мінск, Якуб Колас многа часу аддае літаратурнай дзейнасці.

У кастрычніку ў часопісе «Вольны сцяг» № 3 ён друкуе II—III раздзелы апошняй часткі «Сымона Музыкі» (IV—V раздзелы—у № 4), якую ён у красавіку, яшчэ да свайго прыезду ў Мінск, дасылае ў «Звязду». Працуе над аповесцю «У палескай глушы». У гэты ж час атрымлівае ад НК Асветы БССР прапанову прыняць удзел у літаратурнай камісіі па збіранню вуснай народнай творчасці пры Інбелкульце.

У лісце да Я. Ф. Карскага ад 13 лютага 1922 года ён просіць ад імя камісіі выслаць складзеныя апошнім анкету і інструкцыю па збіранню фальклору.

У пісьме Колас паведамляе і аб тым, што пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны універсітэт. Першым рэктарам універсітэта стаў прафесар У. І. Пічэта.

Калі ў пачатку 1922 года на базе тэрміналагічнай камісіі быў заснаваны Інстытут беларускай культуры, прафесар Пічэта прыняў у гэтым самы актыўны ўдзел. Разам з прафесарамі Я. Дыла і Я. Карскім ён распрацоўваў яго статут.

Арганізацыя Інбелкульта зблізіла Коласа з Уладзімірам Іванавічам Пічэтам. Выдатны вучоны-гісторык адчуў у літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа вялікае будучае беларускай літаратуры. 30 красавіка 1922 года ва універсітэце адбываецца ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае Якубу Коласу. Адкрыў яго рэктар універсітэта акадэмік У. І. Пічэта. На пасяджэнні былі прачытаны даклады: «Асноўныя моманты жыцця Я. Коласа», «Я. Колас як нацыянальны пісьменнік» і іншыя. Беларускі хор Равінскага выканаў песні на словы Я. Коласа.

Летам 1923 года па ўсіх павятовых гарадах Беларусі для настаўнікаў былі арганізаваны палітычна-педагагічныя курсы. Я. Колас прыняў прапанову прачытаць у Слуцку методыку роднай мовы і граматыку беларускай мовы. Работа на курсах вельмі захапіла Я. Коласа, аб чым сведчаць яго пісьмы і артыкул «Слуцкія курсы», надрукаваны ў газеце «Савецкая Беларусь» у 1923 годзе.

Праца на курсах яшчэ больш зблізіла Я. Коласа з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

У гэты час працягваецца творчае супрацоўніцтва з А. А. Сянкевічам, дацэнтам БДУ, былым удзельнікам настаўніцкага з'езда ў Мікалаеўшчыне. Апошні падтрымлівае Коласа як маральна, так і матэрыяльна.

Колас не толькі карыстаўся ўвагай А. А. Сянкевіча, але і сам дапамагаў яму. Асабліва не падабалася Коласу, што выкладчык універсітэта чытае лекцыі па гісторыі БССР на рускай мове.

У лісце да жонкі ён пісаў: **«У тых асоб, якія ўжо пагадзіліся з беларускаю моваю ў школах, застаўся яшчэ адзін козыр. Яны казалі, што беларуская мова і выкладаецца адна, а розныя сур'ёзныя навукі змушаны выкладацца па-расейску. Я кажу Басу (мянушка Сянкевіча.—А. Я.): «Пачні ты, брат, выкладаць па-беларуску. Калі ж небудзь, а трэба будзе ўзяцца за беларускасць». — «Праўда»,— згадзіўся ён, і лекцыі свае, прачытаўшы адну па-расейску, чытае па-беларуску. Я пераглядаю іх, і нятрапныя словы папраўляю. Хацеў накіраваць на гэты шлях і Стасевіча, нашага адэскага беларуса, але ён сказаў, што з вялікай ахвотай зрабіў бы гэта, але не можа, бо ён заняты ў Укоме і не мае часу падгатавацца па-беларуску».**

Адразу ж пасля курсаў Якуб Колас вырашае перайсці на педагагічную працу ва універсітэт.

У верасні ён падае заяву у Прадметную камісію, піша біяграфію.

Падаем гэтыя дакументы, якія маюць сёння нямалую цікавасць:

**«У прадметную камісію Б. Д. універсітэта**
**Члена Інстытута Беларускай Культуры**
**Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа).**

**Заява**

**Прашу назначыць мяне асістэнтам на кафедры Беларускай мовы ў Беларускім Дзяржаўным Універсітэце.**

**К. Міцкевіч (Якуб Колас). 28 IX-1923 г.».**

**«У Літаратурную прадметную камісію**
**Беларускага Дзяржаўнага універсітэта**
**члена Інстытута Беларускай Культуры**
**Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа).**

**Я нарадзіўся ў засценку Акінчыцы Мінскай губерніі, Мінскага павета ў 1882 г. 22 кастрычніка. Айцец мой быў селянінам з сяла Мікалаеўшчыны таго ж павета і служыў леснікам у князя Радзівіла.**

**Скончыўшы Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (Мінскай губерніі, Слуцкага павета) ў 1902 г., я быў настаўнікам у пачатковых школах Мінскай губерніі, Пінскага павета. Зімою ў пачатку 1906 года мяне перамясцілі з Пінскага павета ў Ігуменскі за прапаганду між сялянамі. Летам таго ж года за настаўніцкі з'езд у сяле Мікалаеўшчына я быў зволен ад настаўніцтва і аддан пад суд. Следства вялося да 1908 года. У гэты час у першы раз пачаў друкаваць свае творы ў першай беларускай газеце «Наша Доля» і «Наша Ніва». У 1907 г. напісаў хрэстаматыю «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». 15 верасня 1908 года я судзіўся выязною сесіяй Віленскай судовай палаты ў г. Мінску па палітычнай справе і быў прысуджан на тры гады заключэння ў крэпасці. Гэта заключэнне адбыў у Мінскім астрозе. У час майго заключэння выйшаў з друку першы зборнік маіх лірычных твораў «Песні жальбы». Адбыўшы крэпасць, займаўся прыватна-педагагічнай працаю, а таксама літаратурнаю. У 1912 годзе зноў паступіў на настаўніцкую службу ў г. Пінск. У 1915 г. разам з сям'ёй быў прымушан выехаць у Расію. Быў у Маскоўскай, Пермскай і Курскай губернiях. Займаўся педагагічнай працай, быў школьным інструктарам. У 1921 г. вясною прыехаў у Мінск, быў членам тэрміналагічнай камісіі, а затым членам Інстытута Беларускай Культуры, дзе застаюся і па гэты час. У Мінску выкладаю методыку роднай мовы ў Беларускім педагагічным тэхнікуме.**

**Да гэтага часу выйшлі з друку мае творы:**

**1. «Другое чытанне...» Хрэстаматыя.**
**2. «Апавяданні». Збор прозы.**
**3. «Тоўстае палена», «Неманаў дар», апавяданні.**
**4. «Песні жальбы». Збор вершаў.**
**5. «Родныя з'явы», зборнік прозы.**
**6. «Антось Лата на дарозе жыцця», драматыч. творы.**
**7. «Сымон Музыка», паэма.**
**8. «Водгулле», збор вершаў.**
**9. «Казкі жыцця», проза.**
**10. «Новая зямля», паэма.**
**11. «У палескай глушы», апавяданне.**

**Прыгатаваны да друку:**

**1. «Збор народных казак для дзяцей».**
**2. «Методыка роднай мовы».**
**3. «З віру жыцця», паэзія.**

**8. X. 1923 г.**

**Якуб Колас (К. Міцкевіч)».**

У лістападзе 1923 года просьбу Якуба Коласа задавальняюць. Вось выпіска з пратакола пасяджэння Праўлення БДУ ад 3 лістапада 1923 г.

**«СЛУШАЛИ:**

**1. Протокол заседания Совета Педфака от 26 октября 1923 года.**

**ПОСТАНОВИЛИ:**

**2. Утвердить к исполнению:**

**...д) подтвердить избрание Константина Михайловича Мицкевича на должность преподавателя белорусского языка на педфаке и, на основании 35 ст. Положения о ВУЗах, представить его кандидатуру в Главпрофобр РСФСР и БССР на утверждение».**

2 снежня 1923 года адбылося пасяджэнне навуковага таварыства пры БДУ, прысвечанае творчасці Я. Коласа. Былі прачытаны даклады І. І. Замоціна аб «Новай зямлі», М. Петуховіча аб аповесці «У палескай глушы». Сам Якуб Колас прачытаў апавяданне «Курская анамалія».

Яшчэ праз дзень, 3 снежня , загадам народнага Камісарыята Асветы БССР ён зацвярджаецца дацэнтам педфака БДУ. Снежаньскае пасяджэнне навуковага таварыства мела надзвычай важнае значэнне для Якуба Коласа і яго літаратурнай дзейнасці.

Працуючы выкладчыкам універсітэта, у сакавіку 1925 года Я. Колас камандзіруецца НК Асветы БССР у Калінінскую (цяпер Магілёўскай вобласці.—А. Я.) акругу для чытання лекцый па беларусазнаўству.

Разам з Якубам Коласам выязджае група студэнтаў БДУ.

**«Мне добра памятаецца,—** успамінае І. Аніхоўскі, былы студэнт педфака БДУ, а потым адзін з таленавітых беларускіх журналістаў, — **гэта паездка, калі мяне, разам з другімі студэнтамі педфака БДУ, адарвалі ад вучобы і накіравалі ў Калінінскую акругу. Цяжка прыйшлося працаваць у гэтым далёкім глухім кутку Беларусі. Інбелкульт ішоў на спатканне акруговым установам і дасылаў сваіх працаўнікоў. На працягу ўсяго года прачытана было па раёнах Калінішчыны каля 40 дакладаў сябрамі Інбелкульта.**

**У ліку гэтых дакладаў не апошняе месца займаюць даклады і чытанне сваіх твораў Якуба Коласа. Мне добра прыпамінаецца дзень прыезду Якуба Коласа ў г. Клімавічы. Ажыў і заварушыўся глухі гарадок з прыездам беларускага паэта і песняра, творы якога Калінішчына чытала.**

**Уваход у нардом браўся з бою. Людзей у нардоме біткам набіта. Адчыняю сход...**

**Пры паяве паэта доўга не змаўкаюць воплескі. Не даюць гаварыць. Крыху ўняліся і выслухалі жыццярыс і ў агульных рысах аб творчасці—зноў воплескі без канца...**

**Паэт чытае творы, якіх у друку яшчэ ў той час не было. Усе сядзяць ціхутка і ўважліва сочаць і ловяць кожнае слова... Кончылася... Воплескі...**

**На другі дзень мы ўжо ў дарозе, едзем па раёнах акругі...»**

1926 год у жыцці беларускага універсітэта азнаменаваўся вялікай падзеяй. 31 кастрычніка грамадскасць універсітэта святкавала 25-годдзе навуковай дзейнасці прафесара Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Змяшчаючы справаздачу аб вечары, «Звязда» 2 лістапада паведамляла, што сярод гасцей быў і Колас.

Крыху пазней па ініцыятыве рэктара універсітэта, дэканата педфака і НК Асветы БССР у Мінскім Доме асветы праводзіцца ўрачысты вечар, прысвечаны 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Коласа. Як паведамляла «Савецкая Беларусь», на вечары з прывітаннямі выступілі А. Баліцкі (НК Асветы), З. Жылуновіч, М. Чарот, Ул. Пігулеўскі, А. Галавінскі, К. Німчынаў, У. І. Пічэта, А. Сянкевіч, Я. Пушча, Я. Дыла, У. Галубок, Эпімах-Шыпіла (беларускі культурны і навуковы дзеяч, прафесар Пецярбургскага універсітэта, правадзейны член АН БССР).

Вясной 1929 года Якуб Колас быў абраны калектывам педфака БДУ дэпутатам гарадскога Савета.

Трыццатыя гады ў творчай біяграфіі Якуба Коласа былі надзвычай складанымі. Па-першае, члены маладога літаратурнага аб'яднання «Маладняк», захопленыя лефаўскім лозунгам адрачэння ад старой спадчыны, крыху звысока глядзелі на пісьменнікаў, якія тварылі яшчэ да рэвалюцыі. Ім так і карцела пайсці «ў рожкі са старымі» (лозунг «Маладняка»), толькі сябе яны лічылі прадстаўнікамі партыйнай, пралетарскай літаратуры.

Па-другое, трыццатыя гады—гады росквіту вульгарна-сацыялагічнай крытыкі. Вульгарныя сацыёлагі не шкадавалі сіл і часу, каб дэскрэдытаваць лепшыя творы вядомых пісьменнікаў.

Сапраўды, пасля выхаду паэмы «Новая зямля» ў 1923 годзе не ўся крытыка здолела разабрацца ў ідэйнай накіраванасці паэмы.

І вось тут прыемна адзначыць, што амаль адразу пасля выхаду паэмы з друку глыбокі станоўчы артыкул пра «Новую зямлю» надрукаваў прафесар універсітэта І. Замоцін. Услед за ім, але ўжо ў другой палове трыццатых гадоў, па вартасці ацанілі паэму і іншыя крытыкі, у тым ліку і сённяшні загадчык кафедры беларускай літаратуры універсітэта прафесар М. Р. Ларчанка. З разгорнутай крытыкай вульгарна - сацыялагічных поглядаў на «Новую зямлю» выступіў у 1940 годзе вядомы літаратуразнаўца прафесар Ю. С. Пшыркоў.

Усё гэта хоць у невялікай ступені нейтралізавала праявы вульгарна-сацыялагічнай крытыкі, дапамагала Якубу Коласу верыць у правільнасць абранага шляху, верыць у карысць сваёй працы для роднага народа, партыі.

Вайна зноў закінула паэта далёка ад Беларусі. Але ён па-ранейшаму не парываў сувязі з выхаванцамі універсітэта.

У пісьме У. І. Петухоўскаму з Ташкента Колас пісаў: **«...О Фалее вестей и сведений не имеем...»**

Паэт, вядома, не мог ведаць, што Георгій Георгіевіч Фалевіч — сябра сям'і Я. Коласа, студэнт хімфака БДУ быў кіраўніком падпольнай групы ў Мінску у 1941—1942 гадах і загінуў у гестапа 15 верасня 1942 года.

Першы пасляваенны год супаў з 40-годдзем літаратурнай і грамадскай дзейнасці паэта. 24 кастрычніка ў Маскоўскім клубе пісьменнікаў адбыўся ўрачысты вечар, які адкрыў уступным словам паэт М. Ціханаў.

А 2 лістапада ў Мінску адбыўся агульна-гарадскі вечар, прысвечаны 40-годдзю творчай дзейнасці паэта, 24 лістапада адбылося пасяджэнне Вучонага Савета БДУ. З прывітальнымі прамовамі выступілі рэктар універсітэта П. Савіцкі, дацэнт М. Жыркевіч. Паэты П. Броўка, М. Танк, М. Лужанін прачыталі свае вершы. З словам падзякі выступіў юбіляр. Ён прачытаў некалькі вершаў.

У 1952 годзе грамадскасць рэспублікі ўрачыста адзначала 70-годдзе з дня нараджэння Коласа. 11 лістапада адбылася юбілейная сесія АН БССР, прысвечаная Я. Коласу, 15 лістапада — агульна-гарадскі юбілейны вечар, на якім Коласу быў уручан ордэн Леніна. Паміж гэтымі дзвюма падзеямі 13 лістапада адбыўся ўрачысты сход студэнтаў, выкладчыкаў БДУ і Мінскага педінстытута. Ад студэнтаў універсітэта выступіў А. Лойка. На сходзе прысутнічаў і сам юбіляр. Ён не толькі выступіў з адказным словам, але і напісаў для студэнтаў свае запаветы, якія былі надрукаваны ў шматтыражнай газеце універсітэта. Вось яны:

«Сябрам-студэнтам.

**Дарагія студэнты і студэнткі! Ад ўсяго сэрца прыношу вам і вашым прафесарам і выкладчыкам маю глыбокую падзяку за [illegible] добрыя словы і пажада[illegible], за тую пашану, што ака[illegible] вы мне ў дзень майго 70[illegible] довага юбілею.**

**Дарагія таварышы! Студэнты і моладзь! У вас ёсць тры бясцэнныя дары, якім я магу толькі пазайздросціць, у той жа час і парадавацца. Першы дар— ваша маладосць, сіла, жыццярадаснасць.**

**Другі дар — прасторныя, шырокія дарогі ў жыццё, якія расчыніла перад вамі партыя Леніна і наш Савецкі ўрад.**

**Трэці ваш дар... сягоння яго яшчэ няма ў вас, але ён павінен быць, яго вы абавязаны здабыць — вашаю чэснаю, прынцыповаю, адданаю працаю на славу нашай сацыялістычнай Радзіме, партыі і народу. Гэты ваш дар можа і павінен праявіцца ў мнагаграннай вашай дзейнасці і дзейнасці савецкіх людзей. А для гэтага вам трэба вучыцца, вучыцца і вучыцца, і не толькі ў сценах універсітэта і інстытутаў, але і па за іх межамі.**

**Што ён такое, ваш трэці дар? Гэта ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва, у справу будаўніцтва камуністычнага грамадства.**

**Жыццё наша — бурнае, вясновае разводдзе. Яно не стаіць на месцы, яно развіваецца з дня ў дзень.**

**Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго.**

**Не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу, Камуністычнай партыі, якія расцяць і выхоўваюць вас.**

**Жадаю вам поспехаў ад усёй душы.**

**Няхай жыве наша савецкая моладзь!».**

Наша студэнцтва не забывае пра запаветы выдатнага беларускага пісьменніка.

**А. ЯРОХІН.**

*АД РЭДАКЦЫІ: Беларускі універсітэт займае вялікае месца ў жыцці і творчасці Якуба Коласа. Праца ва універсітэце, шматгадовая дружба пісьменніка з універсітэтам — гэта тэма не можа быць вычарпана адным артыкулам, тым больш, што яшчэ не ўсё ў гэтай цікавай старонцы да канца прачытана.*

*Мы звяртаемся да нашых чытачоў, людзей старэйшага пакалення, да тых, хто добра ведаў Коласа, хто працаваў з ім або вучыўся ў яго, з просьбай дапоўніць гэты артыкул сваімі ўспамінамі ці захаванымі дакументамі, фотаздымкамі, удакладніць асобныя факты, дапоўніць іх.*

*Народны пісьменнік у дзень свайго сямідзесяцігоддзя звярнуўся да студэнтаў з запаветамі. Рэдакцыя запрашае студэнтаў універсітэта расказаць, як яны выконваюць парады і пажаданні любімага настаўніка і сябра моладзі.*

# БОЛЬШ БЛІЗКАЙ СТАЛА ЗЯМЛЯ

Праз некалькі год цяперашнія студэнты закончаць універсітэт, атрымаюць дыпломы. І тады яны будуць трымаць галоўны экзамен, нібы выцягваючы білет з трыма пытаннямі:

1. Ці стаў ты сапраўдным спецыялістам?

2. Якія твае інтарэсы?

3. Як аддзякуеш Радзіме за атрыманыя веды?

Гэты экзамен наперадзе.

А цяпер студэнты трэцяга курса геолага-геаграфічнага факультэта жывуць поўным студэнцкім жыццём. Зімовая сесія ў разгары. Час не вельмі прыемны, але ён неабходны. У сесію студэнт пазнае свае магчымасці, пазнае, што новае набыта ім за семестр.

Праходзячы па калідоры факультэта, бачыш студэнтаў, што стаяць групамі ля аўдыторый з сур'ёзным і заклапочаным выглядам, і, гледзячы на іх, разумееш іх хваляванне. Кожнаму хочацца здаць экзамен як мага лепш. Аднак атрымліваецца гэта не ва ўсіх. Усё залежыць ад настойлівасці, з якой адносіліся да вывучэння курса ў час семінарскіх заняткаў, у час падрыхтоўкі да экзаменаў, наколькі глыбока ўнікалі ў сутнасць прадмета.

У гэтую сесію нашы трэцякурснікі здавалі экзамен аднаму з самых складаных курсаў, якія чыталіся на факультэце — экзамен па фізічнай геаграфіі свету. Чытаў гэты курс загадчык кафедры, доктар геаграфічных навук прафесар В. Р. Заўрыеў.

Студэнты-географы часта жартуюць: «Калі здаў экзамен па фізічнай геаграфіі свету, то Зямля становіцца больш блізкай і зразумелай».

Студэнты-географы захоўваюць у душы глыбокія і добрыя пачуцці да Зямлі, на якой жывуць і вывучэнне якой стала сэнсам усяго жыцця.

Як жа студэнты трэцяга курса здалі гэты экзамен?

Трэба сказаць, што выдатная падрыхтоўка да кожнага семінарскага занятку — гэта выдатная адзнака на экзамене. І, нягледзячы на тое, што курс даволі складаны, каля 30 чалавек атрымалі «выдатна». Нездавальняючых адзнак увогуле не было.

Усебакова і грунтоўна падрыхтаваліся да экзамена Т. Цуркова, Т. Скарынкіна, Н. Яльчык, Л. Васілевіцкая, Г. Гулецкая, В. Сідарэнка, А. Бараноўская, Р. Данюк, Г. Смалякоў, Т. Мароз і іншыя.

Толькі настойлівая і нялёгкая праца магла даць такія вынікі.

В. Р. Заўрыеў з вялікай цеплынёй гаворыць:

— Усё ж прыемна ісці на лекцыі да студэнтаў, добра ведаючы, што яны чакаюць гэтай лекцыі і хочуць многае атрымаць ад яе.

Хацелася б, каб усе экзамены студэнты трэцяга курса здалі такім жа чынам — гэта будзе першай прадумовай таго, каб стаць сапраўдным, улюблёным у сваю справу спецыялістам.

Сесія хутка скончыцца. Пасля — невялікі адпачынак, а потым зноў вучоба.

А пакуль — жадаю поспехаў на экзаменах, добра і весела правесці канікулы.

**Г. РЫЛЮК,**
**ст. выкладчык геолага-геаграфічнага факультэта.**





На здымку ўверсе: за дзвярыма ідзе паядынак.

Справа: перад сесіяй студэнты фізічнага факультэта шмат часу правялі ў лабараторыях: студэнт В. Віткін правярае работу мультывібратара.

Фота І. Аскіркі.

# МУЗЕЮ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА

Музеі нашай краіны займаюць важнае месца ў сістэме ўстаноў, якія вядуць ідэалагічную, вучэбна-навуковую і выхаваўчую работу, яны абслугоўваюць штогод дзесяткі мільёнаў працоўных. Таму невыпадкова, што ЦК КПСС у маі 1964 года прыняў пастанову «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных».

Заалагічны музей нашага універсітэта мае багаты і цікавы экспазіцыйны і калекцыйны матэрыял, які прадстаўляе не толькі фауну СССР, Афрыкі, Аўстраліі, Амерыкі і іншых краін, але і гісторыю універсітэта. Ён дае магчымасць плённа весці вялікую вучэбна-выхаваўчую работу сярод студэнтаў, рыхтуючы высокакваліфікаваных спецыялістаў-біёлагаў, а таксама сярод навучэнцаў сярэдніх школ, тэхнікумаў.

Толькі за мінулы год супрацоўнікамі музея і студэнтамі-біёлагамі старэйшых курсаў праведзена 270 масавых экскурсій, у якіх прынялі ўдзел каля васьмі тысяч экскурсантаў.

Частымі наведвальнікамі нашага музея бываюць замежныя госці з Польшчы, Чэхаславакіі, Індыі, В'етнама. Усё гэта многаму нас абавязвае.

Пры наяўнасці такога багатага матэрыялу перш за ўсё кідаецца ў вочы адсутнасць неабходнай плошчы, каб размясціць усе экспанаты, значная частка якіх зусім не паказваецца.

Пры заалагічным музеі ёсць выдатная майстэрня, дзе можна прыгатаваць не толькі цудоўныя экспанаты, праводзіць заняткі са студэнтамі-заолагамі па авалоданню рознымі методыкамі, па падрыхтоўцы наглядных дапаможнікаў, якія так неабходны для будучых педагогаў, але і праводзіць эксперыменты і назіранні за жывымі аб'ектамі. Нажаль, у цяперашні час у заалагічным музеі няма таксідэрміста, і ў майстэрні чуць «цепліцца» жыццё.

Вялікі калекцыйны фонд, якім валодае музей, захоўваецца ў дрэнных умовах з-за недахопаў спецыяльных калекцыйных шкафоў.

Да гэтага часу заамузей не мае магчымасці арганізаваць разам са студэнтамі-біёлагамі экспедыцыі за межы Беларусі, каб сабраць новыя экспанаты і больш грунтоўна вывучыць фауну СССР. А такія экспедыцыі ў значнай меры дазволілі б павялічыць зацікаўленасць нашых студэнтаў да вывучэння прафіліруючых дысцыплін, садзейнічалі б больш плённай распрацоўцы дыпломных і курсавых работ, удзелу моладзі ў студэнцкіх навуковых гуртках, публікацыі сваіх назіранняў, даследаванняў у навуковых і папулярных часопісах.

Будзем спадзявацца, што адміністрацыя універсітэта прыме належныя меры, каб палепшыць становішча нашага музея.

**М. ЛАГУТА,**
**загадчык заалагічнага музея.**




*Вялікім поспехам карыстаецца выстаўка птушак і акварыумных рыб, якая адкрыта ў біялагічным корпусе нашага універсітэта. Яна арганізавана Мінскім гарадскім аддзяленнем Беларускага таварыства аховы прыроды і студэнтамі-біёлагамі.*

*НА ЗДЫМКУ: у зале выстаўкі.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

# ЦУДОЎНЫ ЧАС — КАНІКУЛЫ

*Да канца сесіі яшчэ шмат часу, але кожны студэнт жыве ў спакусе цудоўнага часу канікул.*

*У прафкоме мы пазнаёміліся з планам зімовых мерапрыемстваў. Дзе пабываюць нашы студэнты ў дні канікул?*

*У турысцкія паездкі па Карпатах, Уралу, Карэліі і Каўказу адправіцца шэсцьдзесят чалавек. Дзесяць груп выйдуць у агітацыйны турысцкі паход па рэспубліцы. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці прымуць удзел у IV універсіядзе ў Ленінградзе.*

*Народны аркестр народных інструментаў здзейсніць творчую паездку ў Маскву.*

*У маляўнічым кутку Беларусі ў доме адпачынку «Нарач» правядуць канікулы сорак студэнтаў.*

*Мінчане і замежныя студэнты здзейсняць лыжныя вылазкі за горад.*

*Канікулы будуць адзначаны і многімі спартыўнымі падзеямі. З 25 студзеня па 6 лютага адбудуцца вучэбна-трэніровачныя зборы лыжнікаў, хакеістаў, канькабежцаў. Нашы спартсмены будуць удзельнікамі таварыскіх сустрэч з камандамі вну іншых гарадоў па лыжнаму спорту, баскетболу, валейболу, фехтаванню.*

*Замежныя студэнты будуць удзельнікамі першынства па валейболу, баскетболу і настольнаму тэнісу.*

*Найбольш прыемным, вядома, будзе адпачынак для тых, хто паспяхова здасць экзамены. Дык няхай настойлівасць і працавітасць не пакідаюць вас да канца сесіі.*

*А. АЛЕЙНІЧ.*

# АД МАРОКА ДА ЗАМБІІ

На мінулым тыдні дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Людміла Аляксееўна Міхайлава падзялілася сваімі ўражаннямі з супрацоўнікамі і студэнтамі геолага-геаграфічнага факультэта нашага універсітэта аб паездцы па афрыканскаму кантыненту. Яе цікавы жывы расказ дазволіў усім, хто прысутнічаў у зале, адчуць дыханне гарачай Афрыкі, а фатаграфіі пазнаёмілі з прыродай, укладам жыцця людзей, іх гаспадаркай.

Людміла Аляксееўна перасекла Афрыку, можна сказаць, уздоўж і ўпоперак. Упершыню яна прызямлілася на афрыканскім мацерыку ў горадзе Касабланцы. У Касабланцы і Рабаце нашых турыстаў уразіла рэзкае раздзяленне людзей па маёмаснаму становішчу, суседства роскашы і жабрацтва.

Затым турысцкі маршрут па Афрыцы пралягаў праз Сенегал, Гвінею, ААР, Судан, Самалі, Кенію, Уганду і Замбію. Расказваючы аб ААР, Л. А. Міхайлава яскрава апісала піраміды Гізэ. Гэтыя грандыёзныя збудаванні старажытнасці стаяць на граніцы пустыні і ўрадлівага берагу Ніла, паблізу Каіра. Самая высокая з іх — піраміда Хеопса. Егіпецкія піраміды і храмы навечна ўславілі геній народа — тых мільёнаў рабоў, потам і крывёю якіх яны былі збудаваны.

У Хартуме (Судан), які размешчаны на «вастрыі» стрэлкі, што ўзнікла пры зліцці Белага і Блакітнага Ніла, савецкія турысты ўпершыню сустрэліся з нілотамі, у якіх вельмі цёмная, амаль чорная афарбоўка скуры, высокі рост. Яны з выключнай цеплынёй адносяцца да рускіх.

Вуліцы Хартума здзіўляюць гасцей стракатасцю рэклам розных замежных прамысловых кампаній.

У Кеніі турысты паглядзелі багатыя нацыянальныя паркі. Асабліва прыгожы Каралеўскі нацыянальны парк у горадзе Найробі. Гэта невялікі запаведнік, у якім у прыродных умовах жывуць сланы, зебры, леапарды, львы, страусы, бегемоты; за плату на іх можна палюбавацца з аўтамабіля (прагулкі па запаведніку пешшу забаронены). Здзіўляе прырода Кеніі. У цэнтральных раёнах тут гаспадарыць вечная вясна: ніколі не бывае ні вельмі холадна, ні завельмі горача.

У Кеніі ж турысты наведалі гавань — Старую Мамбасу, адкуль некалі вывозілі рабоў-афрыканцаў.

Яшчэ больш здзіўляючай і разнастайнай з'яўляецца прырода Уганды, на захадзе якой падымаецца вялікі многаверхі масіў Рувензоры («Месячныя горы»), які ўвенчаны белай шапкай снягоў. Падножжа масіва пакрыта вечназялёным трапічным лесам, у якім жывуць насарогі, разнастайныя віды малп. У гэтых жа трапічных лясах жывуць пігмеі — самыя маленькія людзі, рост якіх каля 130—140 см. Пігмеі па-майстэрску робяць лукі і стрэлы. Яны і цудоўныя танцоры. Танцы іх у большай частцы рытуальныя. Аднак пачуццё таго, што гэтыя маленькія людзі вымушаны таргаваць сваім выглядам і сваім мастацтвам танца, азмрочвала сустрэчу турыстаў з імі.

У Замбіі турысты з захапленнем любаваліся прыгажосцю вадапада Вікторыя, які мясцовыя жыхары называюць «Грымячы Дым». У адрозненне ад іншых вадападаў бурлівы паток вады тут вывяргаецца ў вертыкальную расселіну, таму над бяздоннем пастаянна вісіць туман.

Л. А. Міхайлава расказала аб тых невычарпальных уражаннях, якія засталіся ў памяці турыстаў ад цёплых сардэчных сустрэч з мясцовымі жыхарамі ва ўсіх кутках афрыканскага кантынента.

**Г. ШТЫКАВА,**
**ст. лабарант кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін.**

# ТВАЯ СТАЛОВАЯ

Мой буфет, мая сталовая...

Гэтыя словы цяпер часта чуеш ад многіх людзей, якім прыходзіцца карыстацца паслугамі грамадскага харчавання. Так, ёсць шмат прыкладаў, калі чалавек ходзіць у адну і тую ж сталовую. І не таму, што яна самая бліжэйшая да месца яго работы, а таму, што там добра абслугоўваюць, смачна рыхтуюць страву.

Нажаль, нямногія студэнты могуць сказаць, што яны з задавальненнем заходзяць у свае сталовыя і буфеты. І гэта не дзіўна. Іх не могуць задаволіць ні абеды, ні абслугоўванне, ні санітарнае становішча. Асабліва многа папрокаў на работу буфета ў галоўным корпусе, студэнцкай сталовай па вуліцы Кастрычніцкай. Сталовая адкрываецца ў дванаццаць гадзін, калі ўсе студэнты на занятках, а калі яны вяртаюцца ў інтэрнат, то там застаецца вельмі бедны асартымент блюдаў. Дарэчы, вечарам наогул тут нечым падсілкавацца. Затое, буфет бойка таргуе спіртнымі напіткамі. Студэнты не раз звярталіся да дырэктара сталовай П. В. Васільева з просьбай ліквідаваць недахопы. Але нічога так і не змянілася. Неяк жыхары інтэрната сабралі сход, каб канчаткова дагаварыцца аб вырашэнні ўсіх пытанняў работы студэнцкай сталовай. Дык што вы думаеце — ніхто са сталовай да іх так і не прыйшоў.

Студэнцкая сталовая ў інтэрнаце на Паркавай магістралі адзін час была закрыта з-за антысанітарыі. Ды і не толькі з-за гэтага. Цяпер яна зноў працуе, і зноў тут вельмі абмяжаваны асартымент блюдаў, дрэнна рыхтуюць ежу, студэнтаў не задавальняе і распарадак работы сталовай.

Можна было б прывесці аналагічныя прыклады і па буфетах. Студэнты-філолагі і журналісты скардзяцца, што ў іх буфеце вельмі рэдка можна купіць сасіскі, прыгатаваную свежую рыбу ці натуральнае мяса па даступных цэнах. Але

## ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

рэкорд па скаргах пабівае буфет галоўнага корпуса. Акрамя пералічаных недахопаў, тут прыходзіцца выстойваць у чарзе па трыццаць-сорак мінут...

Днямі мясцком абмеркаваў работу буфетаў у вучэбных карпусах універсітэта і сталовых у студэнцкіх інтэрнатах. Яна прызнана нездавальняючай. Мясцком звярнуўся да ўпраўлення грамадскага харчавання горвыканкома і трэста сталовых Завадскога раёна з просьбай неадкладна ліквідаваць ускрытыя недахопы.

Мясцком стварыў пастаянную камісію па грамадскаму харчаванню і зацвердзіў яе старшынёй Н. І. Юзэфовіча. Камісія ўжо прыступіла да выканання сваіх абавязкаў.

Не павінен заставацца ў баку ад гэтай важнай справы і прафком, і камітэт камсамола. Безумоўна, калі яны арганізуюць сістэматычны кантроль самых студэнтаў за работай сталовых, то і справы пойдуць лепш.

**І. САКАЛОЎСКІ.**

# ЯК СТАЦЬ «МАРЖОМ»?



*Нядаўна ў Мінску адбылася Усесаюзная канферэнцыя па загартоўцы холадам і зімовау плаванню. Яна падвяла вынікі метадычнай работы і навуковых даследаванняў, вызначыла шляхі далейшай працы.*

*На канферэнцыю з'ехаліся прадстаўнікі шасцідзесяці гарадоў краіны: Мурманска, Ленінграда, Нарыльска, Масквы, Кіева, Магадана, Іркуцка і іншых. Вельмі шырока была прадстаўлена Беларусь.*

*З цікавымі дакладамі выступілі навуковыя супрацоўнікі, урачы, трэнеры, ветэраны зімовага плавання. Яны прывялі вельмі цікавыя факты. Так, у тых, хто займаецца зімовым плаваннем, у шэсцьдзесят разоў паніжаецца колькасць захворванняў у параўнанні з астатнімі. Яны хутчэй рэагуюць на халод і раней пачынаюць яму супрацьдзейнічаць. Загартоўка садзейнічае лепшай мабілізацыі абаронных сіл арганізма.*

*На канферэнцыі атрымалі адабрэнне рэкамендацыі для трэнераў, распрацаваныя старшым трэнерам Мінскай гарадской секцыі зімовага плавання, старшым выкладчыкам кафедры фізвыхавання і спорта нашага універсітэта В. Г. Зямцовым.*

*Мы папрасілі Віктара Георгіевіча Зямцова расказаць аб першых кроках загартоўкі.*

**Зімовае плаванне — адна з найбольш старых форм фізічнай культуры. Гісторыя захавала многа прыкладаў, калі высокая ступень загартоўкі рускіх людзей дапамагала пераадолець суровыя жыццёвыя выпрабаванні і прыводзіла да здзіўлення іншаземцаў.**

**Шматгадовым практычным вопытам, атрыманым у групах і секцыях зімовага плавання, устаноўлена, што пры правільнай методыцы заняткаў зімовае плаванне аказвае разнастайны дабратворны ўплыў на арганізм чалавека. Яно ўмацоўвае цэнтральную нярвовую сістэму, павышае працаздольнасць і жыццёвую актыўнасць, ліквідуе цягу да курэння і спіртных напіткаў. Эфектыўна ўдасканальваецца тэрмарэгулятарны апарат чалавека, практычна ліквідуюцца прастудныя захворванні. Як правіла, «маржы» не прастуджваюцца, а калі і здараецца такое, то захворванне праходзіць хутчэй і лягчэй.**

**Методыка загартоўкі і методыка спартыўнай трэніроўкі маюць агульныя заканамернасці: бесперапынная падтрымка становішча трэніраванасці, сістэматычнае прымяненне пастаянна ўзрастаючых нагрузак, выпрацоўка пэўных рэфлектарных рэакцый.**

**Нармальная жыццядзейнасць арганізма магчыма толькі пры ўмове пастаяннай цеплавой раўнавагі, якая рэгулюецца цэнтральнай нярвовай сістэмай.**

**Розныя знешнія тэмпературныя ўздзеянні, у тым ліку ахалоджанне скуранога пакрыцця цела (халодным паветрам, халоднай вадой) выклікаюць адпаведныя тэрмарэгулятарныя рэфлексы, якія падтрымліваюць цеплавы баланс арганізма на патрэбным узроўні.**

**Пры шматразовых і сістэматычных паўторах холадавых уздзеянняў увесь комплекс дадатных і абаронных рэакцый удасканальваецца, замацоўваецца. Арганізм робіцца больш устойлівым да холада, лягчэй супраціўляецца прастудным захворванням і інфекцыям. У гэтым і заключаецца асноўнае значэнне холада як важнага фактара загартоўкі.**

**Поспех загартоўкі ў значнай ступені залежыць ад дозы халадавых нагрузак і паступовага нарошчвання інтэнсіўнасці загартоўваючых працэдур.**

**Загартоўку трэба пачынаць з прасцейшых і найбольш даступных у розных умовах працэдур, якімі з'яўляюцца паветраныя ванны, мыццё ног і паласканне горла халоднай вадой, а таксама вільготныя абціранні і абліванні халоднай вадой.**

**Загартоўку холадам неабходна праводзіць сістэматычна, лепш за ўсё штодзённа, але не радзей двух-трох разоў на тыдзень. Доўгія перапынкі прыводзяць да аслаблення набытых абаронных рэакцый арганізма.**

**Паветраныя ванны лепш прымаць у працэсе ранішняй гімнастыкі і іншых фізічных практыкаванняў. Працягласць іх залежыць ад тэмпературы паветра і ступені загартаванасці.**

**Загартоўку ног можна пачынаць з аблівання іх прахладнай вадой (20—25° С). У першыя два-тры дні працягласць такой працэдуры не павінна перавышаць дзве-тры секунды. Праз кожныя два-тры дні час іх павялічваецца на пяць—дзесяць секунд, пакуль агульная працягласць загартоўкі не дасягне 1,5—2 мінут. Пажадана паступова паніжаць і тэмпературу вады кожны раз на адзін градус.**

**Калі тэмпература вады будзе даведзена да нуля градусаў, можна некаторы час хадзіць босаму па снезе.**

**Загартоўку горла трэба пачынаць з аднаго-двух прапалоскванняў халоднай вадой. На працягу двух-трох тыдняў колькасць іх давесці да пяці-шасці.**

**Абціранне зручней рабіць мокрым ручніком у такой паслядоўнасці: рукі, твар, шыя, грудзі, жывот, спіна, ногі. Рухі рук—ад кісці да пляча. Жывот расціраюць кругавымі рухамі па часавой стрэлцы.**

**Ваду спачатку лепш выкарыстоўваць пры тэмпературы 18—22° С. Праз два—тры тыдні можна прыступіць да наступнай стадыі — абліванне або душ. Працягласць — пятнаццаць — трыццаць секунд, вада — 28—30°, з паступовым паніжэннем тэмпературы на адзін градус да—22°. На гэтым адзначэнні трэба затрымацца два—тры тыдні, пасля чаго магчыма далейшае паніжэнне тэмпературы праз кожныя пяць—сем дзён.**

**Лепшы сродак усебаковай загартоўкі холадам — купанне ў адкрытых вадаёмах. Купанне патрэбна пачынаць летам і працягваць сістэматычна. Працягласць плавання рэгулюецца самастойна ў залежнасці ад тэмпературы вады, паветра, трэніраванасці і стану здароўя.**

**Працэдуры загартоўкі нельга праводзіць пасля моцнай фізічнай стомы, празмернага нярвовага ўзбуджэння, траўм, дрэннага сну, беднага або несвоечасовага прыёму стравы, ужывання алкаголю.**

**Эфектыўнасць загартоўкі холадам і зімовага плавання бясспрэчны. Даказана не толькі іх умацоўваючае, але і лячэбна-прафілактычнае дзеянне.**

**В. ЗЯМЦОЎ,**
**ст. трэнер гарадской секцыі зімовага плавання, ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ.**

# СТУДЭНЦКІ ГУМАР

На экзамене ў медыцынскім інстытуце прафесар задае студэнту пытанне:

— Якім чынам Вы зможаце ў хворага выклікаць пот?

Студэнт назваў некалькі спосабаў.

— А яшчэ як? — спытаў прафесар.

Студэнт задумаўся і праз некаторы час назваў яшчэ адзін спосаб.

— А яшчэ як можна? — зноў запытаў экзаменатар.

Студэнт падумаў і назваў яшчэ адзін спосаб.

— А яшчэ як? — пытары пытанне прафесар.

— Яго трэба паслаць да Вас на экзамен! — закрычаў у адчаі студэнт.

* * *

На экзаменах у амерыканскім каледжы адбыўся наступны дыялаг:

**ЭКЗАМЕНАТАР:** Як уплывае на маральны ўзровень насельніцтва гіганцкае развіццё аўтамабілебудаўніцтва?

**СТУДЭНТ:** Рэзка скарачаюцца выпадкі пакражы коней.

* * *

**Першы студэнт:** Калі дэкан не возьме назад свае словы, то я пайду з універсітэта.

**Другі студэнт:** А што ён табе сказаў?

**Першы студэнт:** Ён сказаў, што я выключаны з ліку студэнтаў.



*Без слоў.*

# УСМЕШКІ МАСТАКА



*— Ну, дык што першаснае, матэрыя ці свядомасць?*



*— Яна таксама ў секцыі «маржоў»?*



*Да экзаменаў рыхтуюцца ўсе, нават выкладчыкі.*



*Студэнт-журналіст на занятках па фотарэпартажу.*



**Малюнкі студэнта III курса журфака А. ПАУЛЯНКОВА.**

**Рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

Зак. 141. АТ 01034. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**